## ШУКЕВІЧ ВАНДАЛІН АЛЯКСАНДРАВІЧ



Імя Вандаліна Аляксандравіча Шукевіча стаіць у шэрагу такіх вядомых дзеячаў на ніве беларускай гісторыі, археалогіі, этнаграфіі і краязнаўства другой паловы XIX - пачатку XXст., як Тэадор Нарбут, браты Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы, Адам Кіркор, Уладзімір Завітневіч, Еўдакім Раманаў і інш. Час, у які выпала жыць і працаваць Вандаліну Шукевічу, вызначаўся сацыяльна-палітычнай складанасцю, насычанасцю гістарычнымі падзеямі, высокай грамадскай актыўнасцю. Гэта не магло не накласці адбітак на асобу ад прыроды таленавітага, зацікаўленага чалавека, які востра адчуваў сваю далучанасць да тых клопатаў і праблем, якімі жыў народ. І сваю неадрыўнасць ад роднага краю, дзе здаўна перапляліся карані літоўцаў, беларусаў, палякаў.

Родавы маёнтак Нача, дзе 10 снежня І852 г. нарадзіўся В. Шукевіч і дзе 1 снежня 1919 г. быў пахаваны, даў Беларусі чалавека з энцыклапедычна шырокім колам інтарэсаў — краязнаўца і навукоўца, працы якога садзейнічалі развіццю нацыянальнай археалогіі і прапагандавалі гісторыю Беларусі ў масавым друку.

На станаўленне асобы В. Шукевіча, фарміраванне яго навуковых інтарэсаў аказалі ўплыў гады вучобы ў Віленскім універсітэце. Нам вядома, напрыклад, што пад уздзеяннем прафесара батанікі і заалогіі Юндзіла В. Шукевіч стаў займацца біялогіяй, антрапалогіяй і старажытнай гісторыяй. Нейкі час ён праводзіў сельскагаспадарчыя доследы ў сваім маёнтку. Але найбольш трывалым захапленнем В. Шукевіча стала археалогія.

Лідскі павет, да якога адносілася Нача ў той перыяд, вылучаўся ў Віленскай губерні як надзвычай багаты на археалагічныя помнікі. Але ў колах навукоўцаў таго часу было прызнана, што гэты раён стаў добра вядомым з археалагічнага пункту гледжання ў многім дзякуючы высілкам В. Шукевіча — галоўнага даследчыка мясцовых археалагічных помнікаў. З І883г., калі В. Шукевіч пачаў актыўна займацца археалогіяй, ён раскапаў толькі ў Лідскім павеце 120 каменных магіл і 170 пахаванняў. Шукевіч першым даследаваў курганы (І6) і каменныя магілы (376) тыпу жальнікаў XIII - XIV ст.ст. Акрамя таго, адкрыў больш за 130 помнікаў каменнага веку. Раскопкі грунтавых і курганных магільнікаў праводзіў каля в. Нача, Пузелі, Вензаўшчына, Дварчаны, Апонаўцы і інш. Увагу Шукевіча прыцягнулі і помнікі археалогіі каля Віцебска, Лепеля, Радашковіч, Дрысвяты. Падчас раскопак даследчыкам было сабрана багата матэрыялаў, якія ўяўлялі цікавасць не толькі археолагам, але і антраполагам, нумізматам, этнографам, мастацтвазнаўцам.

Сёння Вандалін Шукевіч вядомы навукоўцам перш за ўсё як археолаг, але ён з’уляецца яшчэ і аўтарам гісторыка-эканамічных нарысаў, фальклорна-этнаграфічных публікацый. Вядомы тры асноўныя этнаграфічныя працы Шукевіча: "Народныя вераванні і абрады

(забабоны, прымхі, прадказанні і інш.), сабраныя ў Віленскай губерні", "Некаторыя вераванні, прымхі і забабоны нашага народа, легенды і паданні", "Старажытныя лекавыя сродкі". У названых працах даследчык закрануў пытанні народнай псіхалогіі (характар, склад мыслення мясцовага насельніцтва), народнай медыцыны, старажытных вераванняў і ўяўленняў народа, яго абрадаў, легенд, паданняў і іншых праяў духоўнага жыцця. Прыцягвае ўвагу характэрная аўтару прыгожая, вобразная мова. Мастацкасць падачы матэрыялу спалучаецца з лагічнасцю.

Эгнаграфічныя працы В. Шукевіча складаюцца з дзвюх частак: збору помнікаў традыцыйнай духоўнай культуры і каментарыяў да яго.

Артыкул В. Шукевіча "Старажытныя лекавыя сродкі" ўяўляе цікавасць як крыніца па народнай медыцыне. Аналізуючы метады лячэння, даследчык адзначыў выкарыстанне спецыяльных сродкаў, накшталт жывёльнага тлушчу, адвараў траў і г.д., а таксама выкананне пэўных дзеянняў. Да апошніх ён ставіўся вельмі крытычна. В. Шукевіч сістэматызаваў лекавыя сродкі ў залежнасці ад рэчываў расліннага і жывёльнага паходжання.

Яшчэ дзве значныя працы В. Шукевіч прысвяціў духоўнай культуры. Першая "Народныя вераванні і абрады (забабоны, прымхі, прадказанні і інш.), сабраныя ў Віленскай губерні", змяшчае 432 запісы. Дапаўняе гэты збор працы "Некаторыя вераванні, прымхі і забабоны нашага люду, легенды і паданні", у якой апублікаваны тэксты легенд, паданняў, чароўных апавяданняў (15 адзінак), а таксама запісы вераванняў, прымхаў (159 запісаў).

Усе вераванні і прымхі Шукевіч разбіў на 6 груп:

1. Спосабы хутчэйшага замужжа (жаніцьбы);
2. Паводзіны ў замустве, адносіны да цяжарнасці, да немаўлят;
3. Сакрэты, якія забяспечваюць поспех у жыцці і гаспадарцы, спосабы барацьбы з сурочаннем;
4. Спосабы шкодзіць іншым і розныя заклінанні;
5. Варажба і прадказанні;
6. Лячэнні і замовы.

Акрамя арыгінальных запісаў народнай духоўнай культуры, публікацыі В. Шукевіча цікавыя сваімі тэарытычнымі выкладкамі. Напрыклад, даследчык дае тлумачэнні прычын трываласці served перажытачных з’яў у народзе.

Частка гэтых матэрыялаў трапіла ў музеі Пецярбурга, Масквы, Варшавы, Кракава, Вільні, а астатнія склалі хатнюю калекцыю Шукевіча.

Вынікі археалагічных доследаў Шукевіча былі апублікаваны у шэрагу артыкулаў, галоўным чынам у польскамоўных выданнях. І па сённяшні дзень выклікаюць цікавасць яго працы: "Каменныя курганы ў Лідскім павеце” (І899), "Нарысы дагістарычнай археалогіі Літвы" (1901),

Грунтавыя магільнікі з трупаспаленнем каля в. Нача Лідскага павету Віленскай губерні" (I9I3).

У I893 г. у Вільні адбыўся IX Археалагічны з’езд, у якім прыняў удзел і В. Шукевіч. Падчас падрыхтоўкі з’езду быў надрукаваны яго матэрыял па археалогіі Лідскага і Трокскага паветаў. У гэтай працы, якая была адзначана спецыялістамі як арыгінальная і вельмі цікавая, даследчык намаляваў археалагічную карціну дадзенага рэгіёну, абагульніў вынікі ўласных раскопак, даў пералік асноўных археалагічных знаходак. Дакладная паспартызацыя ўсіх матэрыялаў, і тых, што былі накіраваны ў Імператарскую камісію, і тых, што засталіся ў прыватнай калекцыі, надала ім трывалую навуковую значнасць.

Сярод іншых ён называе канкрэтна-гістарычныя ўмовы развіцця беларусаў, калі апошнія былі ў прыніжаным становішчы ў часы Рэчы Паспалітай. Тады дзяржава, на думку Шукевіча, абапіралася на адзін прывілегіраваны клас, а народ застаўся сам па сабе і замкнуўся "у межах свайго быту".

Грамадзянская і чалавечая пазіцыя В. Шукевіча добра прасочваецца ў яго публіцыстычных артыкулах, у прыватнасці ў Віленскай газеце " KurierLitewski" за 1908 год. Чалавечнасць, спачуванне бедам простага люду, любоў да роднага краю, імкненне дапамагчы беларусам у развіцці іх культуры, мовы, паляпшэння эканамічных умоў існавання пранізвае такія працы Шукевіча, як "Яшчэ раз пра галечу", "Статыстыка і рэчаіснасць", "Аб беларускай асвеце" і інш.

Ацэньваючы заслугі В. Шукевіча перад навукай, Кракаўская акадэмія навук абрала яго сваім членам-карэспандэнтам.

**Бібліяграфія:**


1. В посёлке Нача / Ворон. р-н / и в урочищах Плитница и Ланкишки В. А. Шукевич открыл несколько могильных памятников различных эпох // Гуревич, Ф. Д. Древности белорусского Понёманья /Ф. Д. Гуревич; Академия наук СССР. Институт археологии. — М.-Л., 1962. — С. 147—148.
2. Вандалін Шукевіч выявіў больш за 130 помнікаў каменнага веку, раскапаў 16 курганаў і 376 каменных магіл 13-14 ст. на Гродзеншчыне // Археалогія, нумізматыка і геральдыка Беларусі. — Мн., 1979. — С. 23. — (Энцыклапедычная бібліятэчка "Беларусь").
3. Вандалін Аляксандравіч Шукевіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. — Мн., 1993. — С. 661.
4. Вандалін Аляксандравіч Шукевіч // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X-XIX стст.: энцыклапедычны даведнік. — Мн., 1995. — С. 602.
5. Вандалін Шукевіч (1852-1919), беларускі археолаг і этнограф // Каліноўскі, К. За нашую вольнасць: творы, дакументы / К. Каліноўскі. — Мн, I999. — С. 380. — (Беларускі кнігазбор. — Серыя 11. —

Гісторыка-літаратурныя помнікі).
6. История археологического изучения белорусского Понеманья // Гуревич, Ф. Д. Древности белорусского Понеманья / Академия наук СССР. Институт археологии. — М. -Л. 1962. — С. 5—13.
7. Капліца ў в. Нача (Воранаўскі раён) пабудавана ў пачатку ХХст. з бутавага каменю // Кулагін, А. М. Эклектыка: Архітэктура Беларусі другой паловы XIX- пачатку ХХст. / А.М. Кулагін. — Мн., 2000. — С. 228.
8. Каханоўскі, Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. — Мн., I984.
9. Каханоўскі, Г. А. В. Шукевіч (I852-I9I9) // Каханоўскі, Г. А. Прадвесне навукі / Г.А. Каханоўскі. — Мн., 1990. — С. 86—87.
10. Каханоўскі, Г. А. Шукевіч В. А. / Г. А. Каханоўскі // Асветнікі зямлі беларускай: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 473.
11. Каханоўскі, Г. А. Шукевіч Вандалін Аляксандравіч / Г. А. Каханоўскі // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X-XIX стагоддзі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 602.
12. Каханоўскі, Г. А. Шукевіч В. А. / Г. А. Каханоўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1993. – С. 661.
13. Легенды і паданні. — Мн., 1983. — С. 34—37.
14. Ліхадзееў, У. А., Карлюковіч, А. М. Знічкі Айчыны: гісторыя Беларусі ў старых паштоўках / У. А. Ліхадзееў, А. М. Карлюковіч; паштоўкі У. А. Ліхадзеева. – Мінск: Литература и искусство, 2008. – С. 112—114.
15. Магіла Шукевіча Вандаліна Аляксандравіча ў в. Нача Нацкага с/с // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. — Мн., I986. — С. 145.
16. Мінка, Г. Нашы славутыя землякі / Гражына Мінка // Воранаўская газета. – 2007. – 25 красавіка. – С. 4.
17. Руль, Ул. Для сябе і дзеля нашчадкаў / Ул. Руль // Беларуская думка. – 2003. — №10. – С. 190—191.
18. Руль, У. Мець памяць, не забываць / У. Руль // Краязнаўчая газета. — 2000. — № I — 2. — С. 7.
19. Руль, Ул. Памяць аб заслужаных вучоных і патрыётах Бацькаўшчыны неабходна прывесці ў адпаведнасць з іх заслугамі / Ул. Руль // Звязда. – 2003. — 12 лютага. – С. 5.
20. Руль, Ул. Ушануем разам славутых землякоў / Ул. Руль // Воранаўская газета. – 2005. – 27 жніўня. – С. 2.
21. Светозаров, Л. Знаменитый ученый-земляк: Шукевіч В. А. из д. Нача

Вороновского раёна / Л. Светозаров // Воранаўская газета. — 1992. — 28 кастрычніка. — С. 2.
22. Светозаров, Л. Знаменитые земляки: из истории Вороновщины: В. А. Шукевич; Л. Т. Нарбут; Т. Л. Нарбут; С. Б. Юндил; К. М. Подчешинский / Л. Светозаров // Воранаўская газета. — 1996. — 24 студзеня. — С. 2.
23. Светозаров, Л. Монетные вклады: Из истории Вороновщины: Исследования захоронений Вороновского района В. Шукевичем, Я. Зверуго, М. Чернявским, Э. Волтером, А. Квитковской и др. / Л. Светозаров // Воранаўская газета. — 1998. — 21 кастрычніка. – С. 4.
24. Славутыя людзі Воранаўшчыны: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 140-годдзю з дня нараджэння беларускага археолага, этнографа, краязнаўца і фалькларыста В. А. Шукевіча і 145-годдзю з дня смерці буйнога вучонага ў галіне батанікі і заалогіі С. Б. Юндзіла. (3 снежня I992 г.). — Гродна-Нача,1994. – 59 с.
25. Станем пад яго сцягі: да Дня пісьменства і друку: Славутыя людзі, якія нарадзіліся на Воранаўшчыне: В. А. Шукевіч, С. Б. Юндзіл, К. І. Падчашынскі, Л.Т.Нарбут // Воранаўская газета. — I994. — 3 верасня. — С. I.
26. Шкодіч, Н. Этнаграфічнае вывучэнне Лідчыны ў XIX-XX стагоддзях. Вандалін Шукевіч / Н. Шкодіч // Лідскі летапісец. – 2001. — № 2. – красавік-чэрвень. – С. 31—32.
27. Шукевич Вандалин Александрович // Гуревич, Ф. Д. Древности белорусского Понёманья / Ф. Д. Гуревич. – Москва; Ленинград, 1962.
28. Літвіновіч, А. Ф. Шукевіч Вандалін Аляксандравіч // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 2 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 768—769.
29. Шукевіч Вандалін Аляксандравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г. П. Пашкоў і інш.; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 111—113.
30. Чарняўскі, М. М. Неаліт беларускага Панямоння / М. М. Чарняўскі. — Мн., 1979.
31. Brensztejn, M. WandalinSzukiewicz / M. Brensztejn // Zimia. – 1914. — №5.
32. WykopaliskawpoweteLidzkim. Tygodnikilustrowany. – 1885. — № 1; Реферат об археологических местностях в Лидском и Трокском уездах // Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда. – Вильна, 1893.
33. KurhanyKamienne w powiecieLidzkim (gub. Wilenska) // Swiatowit. – 1899. – T, 1902. – T. 4.
34. PrzedmiotybronzoweznalezionenadNiemnem I Mereczanka // Swiatowit. –

1899. – T, 1902. – T. 1.

35. Krzyzezdobne w gubernjiWilenskiej // Wisla. — 1903. — N. 17. DawnelasyKnolewskienaLitwie // Ziemia. 1911. T. 2.